УДК: 61:615.1(043.2)
ББК: 5:52.8
ISBN: 978-985-21-0532-3


***Стральчук М. А.***

## ФРАНЦЫСК СКАРЫНА – ЛЕКАРСКІХ НАВУК ДОКТАР

***Навуковы кіраўнік ст. выкл. Носік А. А.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

Францыск Скарына – гэта чалавек-энцыклапедыя, універсальная асоба. Яго талент праявіўся ва ўсім: пісьменнік, перакладчык, першадрукар, філосаф, лекар, батанік, грамадскі дзеяч. Скарына – заснавальнік усходнеславянскага кнігадрукавання. Яго рознабаковая дзейнасць мела агульнаславянскае значэнне, але асабліва паўплывала на развіццё беларускай культуры. Менавіта таму Францыска Скарыну называюць сапраўдным волатам эпохі Адраджэння.

Усяму свету Францыск Скарына вядомы як першадрукар. Пра яго друкарскую справу напісана шмат кніг і навуковых прац. Але яшчэ ён быў і доктарам лекарскіх навук, чым вельмі ганарыўся. У прадмовах да сваіх кніг ён называў сябе “в лекарских науках доктар Франциск Скоринин, сын с Полоцка”. Менавіта медыцынская дзейнасць з’яўляецца асабліва цікавай старонкай яго біяграфіі. На жаль, на сёння няма дакладных звестак, дзе Скарына набыў медыцынскія веды. Магчыма, што медыцыну ён вывучаў у Кракаве, дзе ў той час ужо дзейнічалі дзве медыцынскія кафедры, а мог працягнуць навучанне і непасрэдна ў Падуі, дзе многія выкладчыкі закрытага ў той час універсітэта выкладалі ў хатніх умовах.

Жыццёвы шлях Францыска Скарыны ў многім паказальны для людзей эпохі Адраджэння з уласцівай ім сілай думкі, шматбаковасцю таленту, вучонасцю. Універсальнасць асобы Францыска Скарыны ставіць яго побач з такімі дзеячамі эпохі Адраджэння, як Леанарда да Вінчы, Рафаэль, Эразм Ратэрдамскі, Томас Мор, а беларускую культуру ўзвышае на еўрапейскі ўзровень.

Репозиторий БГМУ